ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛЮТЫ 19 1933 г.

№ 39 (4583)

Год выданьня XVI

Пакт аб ненападзе паміж СССР і Францыяй уступіў у сілу

Абмен ратыфікацыйнымі граматамі

11 лютага г. г. ПРЭЗЫДЭНТ ФРАНЦУСКАЙ РЭСПУБЛІКІ РАТЫФІКАВАЎ заключаныя паміж СССР і Францыяй пакт аб ненападзе і канвенцыю аб згаджальнай працэдуры, падпісаныя 29 лістапада 1932 г. у Парыжы паўпрэдам СССР ва Францыі тав. ДАЎГАЛЕЎСКІМ і старшынёй рады міністраў Францыі п. ЗРЫЕ.

14 лютага адбылася ратыфікацыя названых дагавораў прэзыдыумам ЦВК СССР.

15 лютага ў Народным камісарыяце замежных спраў намесьнік народнага камісара па замежных справах тав. КРЭСЬЦІНСКІ і пасол французкай рэспублікі п. ДЭКАН у прысутнасьці адказных супрацоўнікаў НК замежных спраў і французкага пасольства правялі АБМЕН РАТЫФІКАЦЫЙНЫМІ НОТАМІ.

З ГЭТАГА ДНЯ САВЕЦКА - ФРАНЦУСКІ ПАКТ АБ НЕНАПАДЗЕ І КАНВЭНЦЫЯ АБ ЗГАДЖАЛЬНАЙ ПРАЦЭДУРЫ УСТУПІЛІ Ў МОЦ.

УМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ І ЗАДАЧЫ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Даклад тав. Л. М. Кагановіча на першым Усесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў 16 лютага 1933 г.

I. Выканаўшы пяцігодку мы сталі магутнай краінай

Таварышы, пяцігодка нашая партыя і мільённая маса рабочых і калгасьнікаў на пленуме Цэнтральнага Камітэту і Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі, а таксама на сесіі ЦВК Саветаў падводзілі вынікі нашых вялізарных перамог, перамог **пяцігодкі** за чатыры гады. Таварыш **Сталін** у сваім дакладзе паказаў усёй краіне і ўсяму сьвету, як мы за кароткі тэрмін **пераўтварылі нашу адсталую краіну.**

СССР ператварыўся з краіны адсталай у краіну магутную, перадавую, незалежную

Калі раней, да пяцігодкі, большую частку з неабходных нам прамысловых вырабаў і, асабліва, машыны, сталь, трактары і г. д. прыходзілася ўвозіць з заграніцы, т. зн. мы былі ў залежнасьці ў гэтай частцы ад заграніцы, то цяпер мы ўжо **самі вырабляем** свой чыгун і сталь, свае аўтамабілі і трактары, свае складаныя варыятаты, здабываем нафту, вугаль, вырабляем хімічныя прадукты, напрыклад, суперфасфат, які так нам патрэбен для ўгнаеньня ў сельскай гаспадарцы.

Апрача таго, мы вырабляем зараз і іншыя прадметы, вельмі капітоўныя для нас на выпадак, калі-б на нас напалі чужаземныя капіталісты. Мы будуем зараз аэраплены, танкі, бронямашыны, артылерыю і т. д., **выканаўшы пяцігодку за чатыры гады.** Мы, таварышы, на будзёнаўскай кавалерыі **дадалі** яшчэ «кавалерыю» тэхнічную, «кавалерыю» лётаючую, поўзаючую, плаваючую і нырэючую,

Посьпехі індустрыялізацыі забясьпечылі нам мір

Калі яшчэ два-тры гады тому назад многія групы імпэрыялістаў адкрыта выказваліся за напад на нашу краіну, то сёньня самыя злосныя ворагі рабочых і сялян, ворагі, якія прагнуць у крыві патапіць нашу савецкую рэспубліку, вынужданы прызнаваць абсурдным тое, што калі-б яны напалі на нас, то мы, калі-б ім жорсткі адпор, яны зразумелі, што порах у нас і іншых падрыхтаваны, што калі яны нападуць на нас, то мы дамо ім здачы. **(Аплёдысмэнты).**

Пяцігодка забясьпечыла нам мір. Вядома, яе трэба супакойваць сябе. Трэба памятаць, што імпэрыялісты могуць у любы момант нападасьці на нас. Гэта трэба цьвёрда памятаць і растлумачваць усім працоўным. Нашы прадстаўнікі, дыпляматы выступаюць перад усімі народамі, змагаючыся за мір. Калі ёсьць краіна на сьвеце, якая сумленна і шчыра жадае міру, то гэта толькі наша сацыялістычная краіна. Мы—як гаворыў таварыш Сталін,—**«ні аднэй пядзі чужой зямлі ня хочам, але і сваёй зямлі, ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддамо нікому».** Мы будуем сваё новае сьветлае жыцьцё, усяляк за вялікую, сусьветную справу. Мы хочам закончыць гэту справу на карысьць працоўных усіх краін, змагаемся за мір, настойваем на развядзеньні. Мы прымаем удзел у пасяджэньнях па развядзеньні з іншымі краінамі. Мы выкрываем там усе хітрыкі, усе махінацыі іншых капіталістычных ворагаў. **Пры гэтым для нас, зразумела, мае** значэньне ня толькі выкрыцьцё. Мы заключаем дагаворы аб ненападзе. І ўжо заключылі, як ведаеце, такія дагаворы аб ненападзе з рядам краін, у тым ліку і з Польшчай. Апошнім часам, што з намі яшчэ не заключае пакту аб ненападзе, ведаюць, што на нас, то яна да гэтага шыхільна паважна прыйсьці.

Што гэта значыць—пакт аб ненападзе? Гэта значыць, што мы заключаем дагавор: мы на іх нападаць ня будзем, яны на нас нападаць ня будуць. Па-цывілізаванаму гэта называецца пакт, а па-просту можна-б сказаць: **ня лезь на нашу зямлю, мы на тваю не палезем; палезеш на нашу—па мордзе дамо. (Бурныя аплёдысмэнты).** Наша партыя выкладае эстрэмальшчыкам у барацьбе за вызваленьне ўсіх прыгнечаных народаў. Мы выступаем у абарону слабых дзяржаў. Капіталісты цяпер адмовіцца ад прынятага, ад сваёй эксплёататарскай прыроды. Найпярэйшым масам, мільёнам працоўных мы паказваем, што ўсе гэтыя марна балбочуць буржуазныя дыпляматы з Лігі нацый проста ашчуканяюць народы. На нашым прыкладзе мы пераконваем мільёны, што толькі ў барацьбе з капіталізмам, толькі тады, калі народы на нашаму прыкладу створаць сваю рабоча-сялянскую рэспубліку, свае саветы,—толькі тады наступіць поўны мір на зямлі.

Наша бальшавіцкая партыя, наш урад умела, разумна, па-ленінску, мудра вядзе сваю цьвёрдую палітыку міру. Бо задача-ж, таварышы, складаная, цяжкая. Вырашыць яе лёгка нельга. Мы акружаны з усіх бакоў капіталістычнымі краінамі. У нас многа ворагаў. Нам трэба краіну—ня проста краіну, а сацыялістычную—абараніць, трэба яе гонар падтрымаць, гонар нашага вялікага працоўнага народу, які зрабіў пралетарскую рэвалюцыю і ўстанавіў дыктатуру пралетарыяту. Трэба не давець групам плаваць на нас, але ў той-жа час трэба ўшкаць сутычак, не давець повану імпэрыялістам напасьці на нас. Партыя і наш урад гаму мудрую складаную палітыку вядуць спакойна, ахоўваючы мір. Нас падтрымліваюць мільёны працоўных усіх краін,—але для таго, каб мір захаваць, нам ня проста трэба таварыць аб міры. Нельга махаць толькі рукамі, узываць вочы на неба, ці спадзявацца «набажэнствы» аб міры. Гутарка гутаркай, а ўмацоўвай вазкую магутнасьць нашай Чырвонай арміі, гэта бадзёрая задача нашай краіны, **сьяты абавязак усіх рабочых і калгасьнікаў. (Працяжныя аплёдысмэнты).**

За апошнія гады,—а хутка мы будзем сьвяткаваць 15-годзьдзе Чырвонай арміі,—мы дабіліся вялікіх посьпехаў у справе ўмацаваньня яе магутнасьці. Наша Чырвоная армія зараз—і мы гэта можам з гонарам сказаць—сьяўляецца **ўзброенай і культурнай сілай.** Яна ў поўным сэнсе слова зьяўляецца **вялікім вартавым нашых родных, крызёю апыскіных, неасяжных савецкіх сацыялістычных межаў. (Аплёдысмэнты).**

Нашы перамогі ў сельскай гаспадарцы

Вялікія посьпехі палітыкі індустрыялізацыі адыгралі вялікую ролю ня толькі для самой прамысловасьці, ня толькі для Чырвонай арміі, але ў асабліваснці яны **маюць вялізарнае значэньне для сельскай гаспадаркі.** Наша сельская гаспадарка цяпер ужо ня тая, чым яна была раней. Яна моцна зьвязана з прамысловасьцю і асабліва з тэй, якая робіць машыны. Сельская гаспадарка ў нас вельмі ўскладнілася, і працоўнасьцяй тут больш, чым у прамысловасьці.

Узьнікнуць прамысловасьці, пабудаваць новыя заводы значыць лягчэй, чым перабудаваць сельскую гаспадарку. І якую сельскую гаспадарку? Дробную, распыленую гаспадарку, дзе былі дзесяткі мільёнаў драбнютэнькіх, распыленых, кавалкавых сялянскіх гаспадарак. І мы дабіліся посьпеху. **У калгасы зараз больш 200 тыс. калгасаў і 5.000 буйных саўгасаў.** І ў гэтыя саўгасы і калгасы, дзякуючы разьвіцьцю прамысловасьці, нам удалося даць вялізарную колькасьць сельска-гаспадарчых машын. Пры гэтым, заўважце, ня простых, а **складаных,** ня толькі на конскай цязе, але і на **трактарнай.**

Перш чым перайсьці да падрабязнага разгляду таго, што мы з вамі заваявалі і што мы маем у сельскай гаспадарцы і чаго мы яшчэ ня маем, дазвольце мне спыніцца на адным вельмі важным і вялікім пытаньні. Гэта пытаньне ўсьнікае ў людзей, якія не разумеюць вялікага значэньня палітыкі калектывізацыі. Неразумеючыя людзі ёсьць і сярод вучоных, ёсьць яны і сярод сялян. Што дзяначаюць тыя вялікія перамогі, якія мы маем зараз у галіне сельскай гаспадаркі? Мы настолькі прыняклі да іх, што цяжка нават адразу ацаніць гэта—ацаніць гэта можна толькі тады, калі ўспомніш, што было ў нас у сельскай гаспадарцы раней, калі ўспомніш, як сялянства змагалася за зямлю. **Успомніўшы гэта, толькі тады зразумееш вялікае значэньне калектывізацыі,** значэньне ўсёй нашай барацьбы за перабудову сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад.

І тут перш за ўсё ўзьнікае часамі такое пытаньне: ці можна было абыйсьціся без калектывізацыі? Ці можна было наладзіць справу так, каб у **горадзе** будаваўся сацыялізм, каб там сьвяцілі электрычнасьць, буцаваліся фабрыкі і заводы, вырабляліся машыны і аўтамабілі, а ў **вёсцы** пакінуць старыя дробныя сялянскія аднаасобныя гаспадаркі?

Ёсьць людзі, якія памылкова думаюць, што можна было-б абыйсьціся без калектывізацыі, выгумалі, моў, бальшавікі гэту калектывізацыю. Памылкова так думаць. Калектывізацыя зьявілася простай жыцьцёвай необходнасьцю. Без яе далей жыць нам нельга было. Дазвольце гэта пытаньне асьвятліць нам на падставе гісторыі нашай барацьбы.

II. Як бальшавікі прывялі сялянства да калектывізацыі

Новая тэхніка ў сельскай гаспадарцы

Апошняе стагодзьдзе, асабліва апошнія дзесяцігодзьдзі, адзначаюцца тым, што шырока разьвілася тэхніка, пачалі будаваць новыя машыны, зьявіліся трактары, пачаўся выраб камбайнаў і іншых складаных сельска-гаспадарчых машын. На зьмену сярпу прыходзіць камбайн. Цэп зьмяніла малатарня. Саху замяніў трактар.

Што азначае гэта бурнае разьвіцьцё тэхнікі? Бязумоўна, вялізарнае прасоўваньне наперад. Але гэта прасоўваньне азначае, што цяпер ужо, калі ёсьць трактар, арэ на маленькім участку ў два-тры гектары немагчыма. **Раз трактар—значыць мяжы сьмерць.** Трактар абвяшчае сьмяротны прыгавор мяжы, пераспалосіцы, маленькім вучасткам. Хочаш ня хочаш, а камбайн нясе мяжы сьмерць, бо камбайн займае амаль столькі-ж месца сам, колькі ў некаторых сялян было зямлі да рэвалюцыі. Не пасьпеш пагарнуцца, аж ужо мяжа, пасева ўжо скончылася, а за ёю чужое ўладаньне, чужы кавалак зямлі. Зрэшце, што адбываецца запраўдашнай, нават ня, дзе трактараў шмат. Там у дробных сялянскіх гаспадарках трактары, камбайны, магутныя малатарні ды на спадзяюце. Нават у Амэрыцы, у хваленай Амэрыцы, і там усяго 18 проц. фэрмэраў, найбольш багатых, маюць у сябе трактар. І гэтыя трактары выкарыстоўваюцца [illegible] супольнасьцю. Камбайн, напрыклад, на Францыі эмаль невядомы. Чаму гэта так? Ды таму, што дробныя сялянскія гаспадаркі гэтых машын купіць ня могуць. У дробных гаспадароў не хапае капіталу, няма грошай на купілю машыны. У іх дробная прыватная ўласнасьць на зямлю, на ўсе прылады вытворчасьці. Вось чаму, пад глядзячы на тое, што сялянская гаспадарка з усіх вытворчасьцяй зьяўляецца самай адсталай, ласьлепшы навукі і тэхніці ў сельскую гаспадарку ўкараняюцца клясьбі за ўсё. І таму прадукцыйнасьць сельскай гаспадаркі ў дробных гаспадарках застаецца нізкай чай нізкай. Што перашкаджае ўзьвышэньню прадукцыйнасьці працы? Прыватная ўласнасьць на зямлю. Гэта галоўная і асноўная прычына. Гэта прыватная ўласнасьць на зямлю перашкаджае прыстасаваньню [illegible] машыны, [illegible] выкарыстаць [illegible] сельскі. Яна перашкаджае [illegible] прадукцыйнасьці працы [illegible] сельскай гаспадаркі, запрымае [illegible] сельскай гаспадаркі ў [illegible], напрыклад, з прамысловасьцю. Які-ж выхад з гэтага? Выхад—гэта ўзбуйненьні **сельскай гаспадаркі.** Пры разьвіцьці капіталізму ўзьнікаюць новыя гарады, будуюцца новыя буйныя заводы і фабрыкі. Капіталізму патрэбен быў сыр-рэц. Яму патрэбны былі рабочыя рукі. А дробная сялянская гаспадарка даць яму гэтага не магла. Вось чаму разьвіцьцё капіталізму штурхала сельскую гаспадарку на шлях узбуйненьня.

Капіталістычны шлях узбуйненьня сельскай гаспадаркі

Што ўзбуйненьне сельскай гаспадаркі нямінуча, гэта ясна кожнаму. Пазбавіць чалавецтва, разьвіцьцё якога ідзе шпарэй тэмпамі, пакідаць яго без харчовых і сырцовых запасаў нельга. Чалавецтва-ж адзінага ня ма. Ёсьць клясы. Пануючыя клясы і клясы прыгнечаныя. Мы зрабілі **пралетарскую рэвалюцыю.** У нас пануе рабочы і селянін. У нас пад кіраўніцтвам бальшавікоў арганізавана савецкая дзяржава. У нас няма прыгнечаньня і эксплёатацыі працоўных мас. Мы вызваліліся ад прыгнятальнікаў і эксплёататараў. У капіталістычным грамадзтве пануюць капіталісты. Там пануюць тыя, хто мае ў сваёй прыватнай уласнасьці машыны, фабрыкі, заводы. Яны ўціскаюць рабочых і працоўных. Які-ж шлях капіталістаў у сельскай гаспадарцы? Вы, напэўна, чулі пра **Карла Маркса** і бачылі яго партрэты. але ня ўсе вы ведаеце, што гэты вялікі настаўнік усіх працоўных займаўся сялянскім пытаньнем і з болем у душы апісаў усе мытарствы і жахі сялянства на шляхох капіталістычнага ўзбуйненьня сельскай гаспадаркі. Неўзабаве будзе пяцідзесяцігодзьдзе з дня сьмерці гэтага геніяльнага чалавека і вучонага. Ён 80 год таму назад, як **Ленін і Сталін** у нашу эпоху, са сваім таварышом Энгельсам вывучаў сялянскае жыцьцё, ведаў і апісваў яго. І вось Карл Маркс, гэты вялікі рэвалюцыйны вучоны, напісаў блыскучыя старонкі, поўныя нянавісьці да капіталістаў за ўціск імі працоўных. Ён апісваў, як ангельскія капіталісты ўзбуйнялі сельскую гаспадарку, як яны зьнішчалі дробных сялян, зьнішчалі іх, літаральна фізычна, выганялі іх з іх уласнай зямлі, забіралі гэту зямлю сабе для аўцаводзтва, агароджвалі абшчынныя землі для сваіх памешчыцкіх уладаньняў, захватвалі і раскрадвалі ў сваю ўласнасьць сялянскія землі.

Сялянства мытарствавала і цярпела голад і галечу сотні год. Яно і сёньня ў капіталістычных краінах церпіць ад жорсткага **крызісу,** які ня зьлітаваўся і асабліва жорстка ўдарыў па сельскай гаспадарцы капіталістычных краін. Там зараз дзесяткі мільёнаў беспрацоўных паміраюць з голаду. І там-жа дзесяткі мільёнаў фэрмэраў, сялян, жабруючых, зруйнаваных крызісам.

У Германіі 7 зямляўласьнікаў маюць сваёй уласнасьці 772 тыс. га, у той час, як 5 млн. сялян маюць 1.588 тыс. га, іншы кажучы, адзін буйны памешчык мае столькі-ж зямлі, колькі ёсьць у 350 тыс. сялян. І зараз, калі сяляне Германіі зруйнаваны крызісам, дапамога з боку буржуазнай дзяржавы аказваецца ня гэтым сялянам, а вось гэтым буйнейшым памешчыкам-зямляўласьнікам. Іменна для іх адпушчана некалькі мільярдаў марак.

Крызіс сельскай гаспадаркі ахапіў ня толькі краіны Эўропы, ня толькі такія краіны, як Польшча, Чэха-Славакія, Аўстрыя, Румынія, але й хваленую калісьці, як багатую краіну, Амэрыку, а таксама і Японію.

Даволі сказаць, што ў **Амэрыцы пасеўная плошча пшаніцы скарацілася** за два апошнія гады на 10 проц., а валавы збор пшаніцы — на 20 проц. У Аўстраліі за адзін апошні год пасеўная плошча скарацілася на 15 проц., у Румыніі — на 17 проц.

У капіталістычных краінах няма куды збываць прадукты. Яны скарачаюць пасевы, выпрацоўваюць свой «плян» недасеву. У рэзультаце гаспадараньня капіталістаў дзесяткі мільёнаў людзей літаральна асуджаны на вымраньне.

Ня дзіва, што ў Амэрыцы служаць цяпер набажэнствы ў цэрквах аб тым, каб «бог» паслаў засуху. Вы ведаеце, што папы калісьці ў Расіі наладжвалі набажэнствы аб дажджы, а там наладжваюць зараз набажэнствы аб сухмяні. Чаму? А таму, каб ня было лішніх прадуктаў, інакш зьменшацца прыбыткі капіталістаў. Не таму, што гэтых прадуктаў многа для працоўных. Не, працоўныя галадаюць. Але прадуктаў цмат і канкурэнцыя зьмяншае прыбыткі капіталістаў. Папы, якія служаць памешчыкам і капіталістам, наладжваюць набажэнствы, каб была засуха. Бодай, можна было-б ім адпраўіць для гэтых набажэнстваў значную частку нашых беспрацоўных папоў **(сьмех, аплёдысмэнты).** Яны хутка да-стасуюцца да амэрыканскіх капіталістаў і набажэнствы пераробяць — замест просьбы «бога» аб дажджы, пачнуць прасіць «бога» аб сухмяні. **(Сьмех).**

Я ня буду тут падрабязна асьвятляць усю карціну становішча заграніцай, якое ёсьць зараз. Нядаўна ў «Правде» быў апублікован рад заметак і лістоў сялян з Польшчы, Амэрыкі і г. д. У гэтых заметках яны апісваюць, якое ў іх цяжкае становішча капіталістаў і набажэнствы пераробяць — замест просьбы «бога» аб дажджы, пачнуць прасіць «бога» аб сухмяні. **(Сьмех).**

Я ня буду тут падрабязна асьвятляць усю карціну становішча заграніцай, якое ёсьць зараз. Нядаўна ў «Правде» быў апублікован рад заметак і лістоў сялян з Польшчы, Амэрыкі і г. д. У гэтых заметках яны апісваюць, якое ў іх цяжкае становішча капіталістаў і набажэнствы пераробяць — якая ў іх **беспрасьветная будучыня пры капіталізьме.** У іх няма прасьвету.

І ў нас бываюць труднасьці. Але нашы труднасьці зусім іншага характару. Яны зьвязаны з ростам, з вялізарным будаўніцтвам новага. Колькі сялянін ведае, калі ён будуе дом, што будуе ён яго не таму, што ён зруйнаваны, а таму, што ў яго зьявіўся дастатак. Пакуль дом ён пабудуе, ён эрзумела, церпіць некаторыя труднасьці. Часамі вымушан і кароўку прадаць, каб купіць будаўнічыя матэрыялы, купіць жалеза для даху. Але затое ён ведае, што дом у яго будзе сапраўдны, сьветлы, дзе жыць ён будзе зусім інакш, па-новаму. А мы-ж з вамі будуем на проста дом сялянскі, а вялікі будынак сацыялізму. Вось чаму ў нашага селяніна базісная **рэчаіснасьць і сьветлая будучыня.** Ён, калі селянін, ведае [illegible] гэтае будучыні залежыць ад нас самых, ад нашай волі і энэргіі, ад нашага ўменьня. А там, дзе капіталісты і памешчыкі, там бес прасьветная будучыня, калі капіталізм ня будзе скінут. Перад сялянамі капіталістычных краін сьцьвяне стаіць так: **або сьмерць,** або пайсьці на нашаму рускаму шляху — **скінуць па мешчыкаў і капіталістаў і атрымаць тады новае сьветлае жыцьцё. (Аплёдысмэнты).**

Рэвалюцыйны рух рабочых і сялян у капіталістычных краінах расьце і палыраецца. Зрэшты, капіталісты яшчэ одурманьваюць мас. Яны зараз арганізуюць фашыцкія партыі, якія прыкрываюцца іншымі, яшчэ канчымі абіцаньнямі. Яны нават казыяваюць сябе нібы як пацыяліты-сацыялісты, а на самой справе гэта сапраўдныя азьвярэлыя буржуі, якія ашукваюць сялянскія і працоўныя масы.

Але там расьце і мацнее другая сіла, сіла нашай бальшавіцкай партыі, якая цьвёрда, па-рэвалюцыйнаму ўпарта стаіць на сваім пасту, растлумачвае масам рабочых і сялян, арганізуе іх на барацьбу супроць капіталізму. Сёньня ў іх яшчэ сіл не хапае для таго, каб скінуць капіталістаў і памешчыкаў. Але мы ведаем, што час рэвалюцыйнай перамогі ва ўсім сьвеце набліжаецца. Яны дабіваюцца такіх-жа перамог, якіх дабіліся мы. Буржуазныя вучоныя ў страху перад рэвалюцыйнай шукаюць выхаду са становішча. Прабуюць дастасаваць плян, займаюцца «плянаваньнем» гаспадаркі, але з гэтага «пляну» нічога ў іх ня выходзіць. Чаму ня выходзіць? Ня выходзіць таму, што пры капіталізьме, пры прыватнай уласнасьці на зямлю, на фабрыкі і заводы шчкага адзінага пляну быць ня можа. Адзін выробліце столькі, другі стараецца яго перагнаць, канкурэнцыя і крызісы **няміну чы,** заняпад гаспадаркі выклікаецца самім разьвіцьцём гэтай гаспадаркі. Гэта ўжо закон капіталістычнага разьвіцьця, дказаны жыцьцём.

Вучоныя Амэрыкі б'юцца, б'юцца, а плян у іх ня выходзіць. А ў нашага ўчарашняга адмасобніка Міцюхі, сёньняшняга калгасьніка, плян у калгасе выходзіць **(сьмех).** Ён арганізуе свой плян, плян калгасны. Не заўсёды, праўда, яшчэ добра, але ёсьць [illegible] шмат добрых дасягнуў. Я [illegible] напрыклад, як адзін бесдартыйны, лы камандзір разьведкі Чырвонай арміі ў Шабліеўскім сяле, Сальскага раёну, Паўночнага Каўказу, зараз арганізаваць сваю арцель. На сьцяне ў яго вісіць вытворчы пляц. Усё ў яго прадумана і намечана да нітачкі. Ён здолеў і сена скасіць своечасова і атрымаць убраць і ўраджай атрымаць. Ён здолеў і **абавязацельства перад дзяржавай выканаць і гародніну прадаць на рынку, разьвіваючы калгасны гандаль.** Атрымаўшы грошы, ён расплаціўся па даўгавых абавязацельствах. Нам ён паказаў: «Вось у мяне сотня, прыбыткаў у мяне столькі і столькі». Па вучонаму гэта называецца сальдо і баланс. А ў яго па-свойму выходзіць: замест балянсу ён атрымаў «бляшнец» **(сьмех).** І ўсё гэта выходзіць у яго плян лепш, чым у амэрыканцаў. **(Аплёдысмэнты).**

Таварышы, я вам коратка расказаў **аб капіталістычным шляху сельскай гаспадаркі.** Ясна для кожнага, што гэты шлях нам не падыходзіць. Божны рабочы, колькі сялянін ахапіць гэты шлях, папрабуй нашаму селяніну бедняку і серадняку прапанаваць вярнуцца да капіталістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі?

Папрабуй і паглядзі, што ён адкажа на гэта. Ён скажа-не, ужо дзякуй, пацярпелі пад ярмом капіталізму. Шмат ахвяр пакінуў, а цяпер капіталістычны шлях намі забракован, адкінут на звалку. А для таго, каб ён са звалкі не падняўся, як прабуюць падпімаць ца са звалкі кулакі, спэкулянты і інш. сволач, мы яму выкопваем глыбейшую яму і ў гэту яму глыбока, глыбока закопваем нашых ворагаў і асінавы кол забіваем, каб больш яны не вярнуліся і гэты капіталістычны шлях да нас з сабой ня ўдушкі прыцягнуць. **(Аплёдысмэнты).**

Падрыхтоўка сацыялістычнага шляху ўзбуйненьня сельскай гаспадаркі

Мы выбралі, таварышы, сацыялістычны шлях узбуйненьня сельскай гаспадаркі. Для таго, каб павесьці сялянства па сацыялістычнаму шляху разьвіцьця, трэба было прайсьці рад ступеняй. Адразу ня выскачыш. Трэба было, **па-першае,** падрыхтаваць перамогу рэвалюцыі. Трэба было, **па-другое,** заваяваць уладу і абаронім гэту ўладу ў грамадзянскай вайне. Трэба было, **па-трэцяе,** адначасова зруйнаваную імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайной гаспадарку. Трэба было, **па-чацьвертае,** пасьля адначасьленьня гаспадаркі прыступіць да пераробкі ўсёй нашай прамысловасьці і да сацыялістычнай пераробкі сельскай гаспадаркі. Гэта тое, што мы зараз з вамі робім. **Сацыялістычны шлях узбуйненьня сельскай гаспадаркі — гэта калгасы і саўгасы.** Гэты сацыялістычны шлях ня выскачыў нечакана. Сёй-той думае: «Вось сядзелі, сядзелі бальшавікі і потым раптам у 1928-29 г. разгарнулі суцэльную калектывізацыю і як бы сьнег на галаву зваліўся». Не, таварышы, гэты шлях быў прадугледжан, проста, можна сказаць працоўкі прадугадан Карлам Марксам і Энгельсам яшчэ шмат гадоў таму назад. А за імі ў барацьбе супроць здрадніка, называўшых сябе «сацыялістамі», вялікія правадыры рабочае клясы і сялянства нашай эпохі Ленін і Сталін і ўся наша партыя па працягу многіх, многіх гадоў ня толькі заклікалі да калектывізацыі, але й распрацоўвалі тэорыю і практыку ажыцьцяўленьня калектывізацыі. Партыя Леніна вела, куды і як весьці сялянства. Яна вела, што перамога прыйдзе не адразу. Ёсьць шмат людзей, якія называюць сябе «сацыялістамі», людзей, якія балбочуць аб сацыялізьме, а калі справа даходзіць да сацыялізму, то яны яму здраджваюць. хочуць, напыклад, выйсьці са становішча, стараючы каапэратывы ў буржуазных краінах, але каапэрацыя ў буржуазных краінах гэта — толькі прыпатак та капіталізму. Гэта не сацыялістычны шлях разьвіцьця — гэта атэй абмен. Прыпамятайце эсэраў. Яны называлі сябе моцна: сацыялістамі-рэвалюцыянэрамі. Здавалася-б, чаго яшчэ трэба: і «сацыялісты», і «рэвалюцыянэры». І многія сяляне ў 1917 годзе падцаліся на гэту вуду. А што вышла? Дзесяткі год гэтыя балбатуны і здрадзікі высоўвалі на словах лозунг «зямля і воля», а што вышла на справе? Калі ў 1917 годзе цара скінулі, то сяляне зразумелі гэта так: «Ну, цара скінулі, а цар-то гэта быў першы памешчык сярод памешчыкаў, зна чыцца, за царом трэба і ўсіх памешчыкаў прэч». Так зразумелі сяляне і правільна зразумелі. А што зрабілі эсэры? Калі на чале ўраду стаў Керанскі, таксама эсэр, калі міністрам зямляроблства стаў Чарноў і інш. — яны разам з князем Львовым, разам з памешчыкамі **пасылалі карныя атрады супроць паўстаўшых сялян,** якія захватвалі памешчыцкія сядзібы, памешчыцкую зямлю. Ёсьць рад загадаў, якія зараз гучаць сьмешна, загады, скажам, таго-ж Керанскага, які пісаў, што, моў, нельга чужую ўласнасьць чапаць, бо яна прыватная ўласнасьць, і той, хто яе чапае, той выступае супроць бацькаўшчыны. Эсэры аказаліся нікчэмнай цацкай у руках памешчыкаў і капіталістаў. Дзесяткі гадоў яны балбаталі аб «зямлі і волі», а калі дайшло да справы, яны здрадзілі сялянам, здрадзілі рабочым і разам з меншавікамі і памешчыкамі пайшлі супроць рабочых і сялян, пачалі іх кідаць у турму і расстрэльваць. За што? Затое, што сяляне, якія стагодзьдзямі чакалі заветнай гадзіны атрыманьня зямлі, хацелі ажыцьцявіць сваю волю і адабраць сваю зямлю ад памешчыкаў.

Ленін разумеў справу інакш. Ён бачыў і растлумачваў, што сялянства ня першы дзень змагаецца за свае вызваленьне. **Гісторыя сялянства ведае вялікія рэвалюцыйныя рухі мас. Гэта** гісторыя ведае шмат **сялянскіх рэвалюцыйных войнаў.** Напрыклад, у Германіі, у сярэднія вякі, сотні год таму назад сялянства жорстка і ўпарта змагалася ў крывавай схватцы з памешчыкамі. Яно забірала дваранскія кавёткі. Але сялянства было здраджана.

(Працяг на 2 стар.).

Працяг дакладу тав. Л. М. Кагановіча

І ў нашай вялікай краіне сялянства да рэвалюцыі таксама ня спала. Яно ўзнімалася, яно высоўвала сваіх герояў. Такія **героі сялянскіх паўстаньняў**, як Балотнікаў, Сьцяпан Разін, Пугачоў, змагаліся супроць баяр, памешчыкаў і князёў, узьнімаючы на бой забітых халопаў. Гэтыя паўстаньні былі паўстаньнямі сялян, паўстаньнямі прыгоньнікаў супроць уціску, гвалту, зьдзекаў, пакут, пекла, супроць усяго, што было для мільёнаў працоўных сялян створана самаўладзьдзямі, памешчыкамі, тыранамі, якія мучылі душу і цела селяніна.

Чаму-ж, пытаемся, гэтыя сялянскія паўстаньні **царпелі паразкі** ня за паражэньнем? Чаму Сьцяпан Разін, які забраў горад гарадоў, чаму Пугачоў, які падначаліў Паналожжа і Урал, пакажылі свае галовы на пласе? Чаму?

На гэта пытаньне адказаў Леніп. Таму, — сказаў ён, — што ў горадзе ў сялян ня было шырэйшага саюзьніка, таму, што ў горадзе ў селяніна, разрозьненага па вёсках на сваіх дробных кавалачках, **ня было кіраўніка.**

Горад быў глыбока варожы да сялянства. Але вось зьявіўся **пралетарыят**, на сцэну выйшла новая кляса. Для перамогі сялян трэба было, каб **яны пайшлі ў саюз з гарадзкімі рабочымі**, з пралетарыятам, трэба было, каб **яны пайшлі ў атаку супроць сваіх клясавых ворагаў пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго партыі.** Чаму патрэбна гэта кіраўніцтва? Ды таму, што рабочыя аб'яднаны, яны працуюць не на асобных кавалачках, яны жывуць не ў маленькіх вёсачках, раскіданых адна ад адной на дзесяткі бездарожных вёрст. Рабочы аб'яднаны на фабрыцы і заводзе. Ён рэвалюцыйны да канца. Ён больш культурны, бо сам варштат, сама машына патрабуе культурных адносін, і прамысловасьць выкоўвае з яго больш перадавога, больш пасьлядоўнага рэвалюцыянэра.

Пралетар у горадзе яднаецца ў палітычныя арганізацыі. Ён мае міжнародныя сувязі з пралетарамі іншых краін. Пралетарыят гэта — **адзіная кляса, якая можа вывесьці сялянства з яго адвечнай цемры і арганізаваць яго ў штурмовыя батальёны для барацьбы з кулацкай кабалой і памешчыцкім уціскам.**

Вось як Ленін разумеў справу. На працягу дзесяткаў год Ленін, яго партыя, правадыр нашай партыі, лепшы паплечнік Леніна тав. Сталін, падрыхтоўвалі вялікую перамогу, працуючы ў падпоньлі, ідучы на катаргу, у Сібір у турму, на шыбеніцу. Бальшавікі разбілі сваю справу і **падрыхтоўвалі вялікую пралетарскую рэвалюцыю.** Рэвалюцыя прымусіла. Адна адзіная партыя партыя бальшавікоў, партыя Леніна, сказала: **калі ты, селянін, хочаш забраць зямлю ў памешчыкаў — ідзі разам з рабочымі. Пойдзем разам і супроць памешчыкаў і супроць капіталістаў.** Ня проста пойдзем, не праз балбатню ва ўстаноўчых сходах, а скінем іх, зьнішчым, заваюем улады і ўзьнімем чырвоны сьцяг вызваленай працы ў вялікай савецкай краіне. **(Працяжныя апляды сямэнты).**

Пралетарыят—кіраўнік сялянства

Заваяваўшы ўладу першай справай трэба было забраць **зямлю памешчыкаў.** На адной толькі РСФСР (без акраінаў) бядняцка-серадняцкае сялянства атрымала 52 млн. гектараў памешчыцкай, царкоўнай і ведамаснай зямлі і каля 50 млн. гектараў кулацкай зямлі. Усяго яно атрымала звыш 100 млн. гектараў зямлі і больш чым падвоіла колькасьць зямлі, што была ў яго да рэвалюцыі. На Украіне ў беднякоў і сераднякоў да рэвалюцыі было 20 млн. дзесяцін, а пасьля рэвалюцыі стала 35 млн. дзесяцін.

У гэтай барацьбе разам з пралетарыятам ішлі ўсе асноўныя масы сялянства. Калі мы гаворым аб саюзе рабочых і сялян, дык гэта ня пустая фраза. **Ня ўсякі селянін можа ў любы час быць у гэтым саюзе.** Партыя рабочых заўсёды ўлічвала, якія сяляне, калі, на якім этапе рэвалюцыі, пад якімі лёзунгамі могуць ісьці ў саюзе з рабочым, у саюзе з пралетарыятам, пад яго кіраўніцтвам.

На наступным этапе рэвалюцыі частка сялянства ня толькі захісталася, але і пайшла супроць. Гэта было калі чэхаславацкае паўстаньне адбылося ў Самары, гэта было тады, калі вёска падзялілася на два лягеры. Пры цяперашнім капітэты бедняты.

У вёсцы выступіў **кулак** супроць нас, а беднота і значная частка сераднякоў пашлі з намі. Многія думалі, што выступленьне кулацкай часткі сялянства гэта наша слабасьць. Не, гэта было нашай сілай. Гэты факт паказаў, што ў нашай вёсцы ёсьць сілы ня толькі для таго, каб памешчыкаў прагнаць, але ёсьць сілы і для таго, каб ліквідаваць і капіталістаў. Выгнаць памешчыкаў без выгнаньня капіталістаў нельга. Гэта трэба зразумець. Гэты факт паказаў, калі, што сялянства, наперакор цьвердзіньням трацкістаў, ідзе з намі па сацыялістычным шляху. Гэта і забясьпечыла нам перамогу ў грамадзянскай вайне.

Серадняк займаў заўсёды асобнае становішча ў саюзе пралетарыяту і сялянства. Серадняк хістаўся, бядняк разам з батрацтвам, пад кіраўніцтвам рабочых, самааддана і стойка ішоў наперад. Ён быў нашай апорай на вёсцы. Партыя ведала асаблівасьці серадняка. Яна ведала, што серадняк хістаецца таму, што ён мае дзве душы: з аднаго боку, душа мазалістая, працоўная, душа чалавека прыгнечанага, а з другога боку — душа дробнага прыватнага ўласьніка, гандляра.

Партыя ведала, што пры правільным кіраўніцтве серадняк здолее сваю другую душу — душу прыватнага ўласьніка зьнішчыць, ліквідаваць, перадаць не панам (сьмех), а сабе пакінуць душу працаўніка, які разам з рабочымі будуе новае жыцьцё, новае сацыялістычнае грамадзтва **(аплёдысмэнты).**

Так арганізавалі мы перамогу ў грамадзянскай вайне. Перамога гэта была вельмі цяжкая, але мы не дасягнулі.

Адпак, разьбіць памешчыкаў і капіталістаў — гэта, таварышы, толькі яшчэ частка справы. Сацыялізм павінен зьнішчыць усякае прыгнечаньне. Сацыялізм павінен стварыць новае грамадзкае жыцьцё. Ён ня можа быць пабудован, калі засталіся карэньні, карэньчыкі, глеба для росту капіталізму. А дробная сялянская гаспадарка заўсёды вяўлялася і зьяўляецца карэньчыкам для росту капіталізму. Іншы селянін, не згадзіўшыся з гэтым, скажа: «Давольце, які-ж я капіталіст, я-ж працаўнік, я серадняк».

Але, таварышы, справа не ў серадняку, справа ня ў тым, што працаўнік, сутнасьць справы заключаецца ў тым, што, пакідаючы індывідуальную гаспадарку, мы дапускалі памылку, хочаш ці ня хочаш, разьвіцьцё свабоднага гандлю. А разьвіцьцё свабоднага гандлю азначала разьвіцьцё гандляра, зьяўленьне спекулянта, узьмацненьне і рост кулака.

Адпак, пасьля грамадзянскай вайны перайшлі да адпраўджаньня, калектывізацыі, будаўніцтва калгасаў у масавым маштабе нельга было, бо гаспадарка была разбурана. Мы ў 1921 годзе ўвялі нэп (новая эканамічная палітыка). Што такое нэп?

«... нэп ёсьць асобная палітыка пралетарскай дзяржавы, разьлічаная на **дапушчэньне** капіталізму пры наяўнасьці камандных вышынь у руках пралетарскай дзяржавы, разьлічаная на **барацьбу элементаў капіталістычных і сацыялістычных,** разьлічаная на **ўзрастаньне** ролі сацыялістычных элементаў у страту элементам капіталістычным, разьлічаная на **перамогу** сацыялістычных элементаў над капіталістычнымі элементамі, разьлічаная на **зьнішчэньне** клясаў, на пабудову фундамэнту сацыялістычнай эканомікі. Хто не разумее гэтай пераходнай дваістай ролі нэпу, той адыходзіць ад ленінізму» **(Сталін, XIV партзьезд, 1925 г., стэнагр. справаздача, стар. 493).**

І ў вёсцы, і ў горадзе сёй-той няправільна зразумелі нэп. У іх ліку былі і беспартыйныя, і некаторыя партыйцы.

Яны думалі так, ну што-ж, узялі ўладу бальшавікі, разьбілі генэралаў, а цяпер свабодны гандаль, індывідуальная гаспадарка, гандляр, спекулянт, і справа пойдзе так, што наступова, паступова у нас адновіцца нешта накшталт старога ладу, зноў адродзіцца капіталізм, свабода для прыгнятальнікаў і работа для працоўных.

Рэвалюцыі былі розныя. Ва Францыі таксама даўно ўжо скінулі цара, забралі зямлю, а потым дазволілі свабоду гаспадарання і разьвіцьця кулака, зноў памешчыкі зьявіліся, новыя капіталісты прышлі, і сялянства зноў было прыгнечана. Гэта была **буржуазная рэвалюцыя.** Мы рабілі **пралетарскую рэвалюцыю** і таму пасьля грамадзянскай вайны, упарта і настойліва адпаўляючы гаспадарку на аснове нэпу, мы **ўесь час вялі і вядзем палітыку на поўнае зьнішчэньне клясаў.** Гэтага не разумелі трацкісты і правыя ўхілісты, якія былі і застануцца ахвярамі эсэраўшчыны і меншавізму. Яны варожы ленінізму, бальшавізму.

Чаму, напрыклад, Троцкі зваліўся ў лягер меншавікоў, у лягер перадавых байцоў контр-рэвалюцыйнай буржуазіі? Ён ня верыў у сілу пралетарыяту і непавідзеў сялянства. Ён ня верыў у сілы нашай рэвалюцыі. А таму ён быў супроць ленінскай тэорыі паўдовы сацыялізму ў нашай краіне. Трацкісты думалі, што без **саюзу з сялянствам** можна будаваць у горадзе фабрыкі і заводы, а вёску трымаць па-старому ў бесправасьцьвітнай цемры. А правыя разважалі: ня трэба нам новых фабрык і заводаў, няхай ідзе разьвіцьцё кулацтва, поўная свабода гандлю. Правыя думалі паўзком у саюзе нават з кулаком паціхеньку ды памаленьку самацёкам без барацьбы ўехаць у царства сацыялізму. Гэты шлях правых ухілістаў вядзе да разьвіцьця капіталізму, новага закабаленьня бедняка і серадняка.

Партыя — яе ЦК і ў першую галаву тав. Сталін — ня так разумелі справу будаўніцтва сацыялізму. Яны разумелі, што трэба **стварыць моцную сацыялістычную базу, пабудаваць фундамант сацыялістычнага будынку.** Бяз гэтага немагчыма **палепшыць становішча рабочых і сялян, бяз гэтага немагчыма было вывесьці краіну на шырокі сацыялістычны шлях.**

Адкінуўшы ўсялякія хістаньні, уступіўшы на шлях разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце, мы высунулі **вялікі план індустрыялізацыі** нашай тэхнічна адсталай краіны. Шырокім фронтам **павялі калектывізацыю,** падрыхтавалі пераход **да суцэльнай калектывізацыі** і на аснове яе павялі палітыку **ліквідацыі кулацтва як клясы.** Упарта і паярыва, крок за крокам мы падрыхтоўвалі глебу для зьяўленьня калектывізацыі.

Як мы праводзім калектывізацыю

Чаму нельга палепшыць становішча сялян без калектывізацыі? Кастрычніцкая рэвалюцыя дала сялянам зямлю.

Пасьля Кастрычніцкага перавароту шмат бесзямельных атрымалі зямлю, з другога боку, селяніне, атрымаў шмат зямлю, пачалі дзяліцца.

Лік дробных сялянскіх гаспадарак пасьля рэвалюцыі яшчэ больш павялічыўся. Замест 20 млн. сялянскіх гаспадарак у нас да 1927 году стала 25,5 млн. дробных сялянскіх гаспадарак. Ці-ж можна было ў гэтай дробнай і найдрабнейшай сялянскай гаспадарцы ўжываць машыны? Ці-ж можна было палепшыць і палегчыць працу? Ды зразумейце-ж, таварышы, што селяніне пасьля рэвалюцыі абудзіўся, у іх узьнялася сьвядомасьць, зьявіўся гонар.

Селянін ужо ня хоча працаваць пастараму. Трэба было знайсьці выхад са становішча. Ні гечна-ж жыць так, як жылі сотні год таму назад. Ня вечна-ж жыць і працаваць касой, серпом, сахой. Трэба было даць мільёнам працоўнага сялянства нейкі выхад у сьветлую будучыню. Калі ня сёньня, дык праз два гады, не праз два гады, дык праз пяць год. Навіцаць сялянства ў бесправасьцьвітнай цемры, у жудасных умовах цяжкай працы, у жудасных умовах цяжкай, змор вакочай працы нельга. Вялікую дзікасьць, бескультур'е трэба было ў корані пакарэньні з'нішчыць, каб потым зусім зьнішчыць. Партыя, разьлічыўшы свае сілы, пасьля адпаўленьня гаспадаркі, партыя рабочае клясы разам з перадавымі калгаснікамі пастаўила пытаньне так: або кулак, спекулянт і гандляр, або калгаснік, ударнік сацыялістычных палёў, змагар за сацыялізм. Калі кулак, тады **ваяваньне** рэвалюцыі ідзе прыцэл капец, бо кулак выступіць разам са шкоднікамі і будзе змагацца за зварот капіталізму. І невыпадкова лапушкін пытаўся так: французскія імкрыялісты на чале з Пуанкарэ, шкоднікі з усіх гарадоў — Рамэн, кадэты-цэцы — кулак у вёсцы. Так чапляецца зьвяно за зьвяно ў гэтым ланцужку.

Плян быў ня толькі ў нас. Яны, на яны ворагі, мелі свой плян. Калі я быў у адным калгасе ў гутарыў з калгаснікамі, я хацеў даведацца, ці разумеюць яны як сялян палітыку партыі. Я запытаў: [illegible]ацце, як вы думаеце? Вось у [illegible]трудзіцы. Верна, можа быць мо[illegible] ня так шпарка ісьці [illegible] можа быць мож на было ісьці [illegible]альней?». Адна калгасьніца, малапісьменная, адказала мне па-ўкраінску: «Ні, тав. Каганович, не можам мы так ждати, нам нэколи, бо и гадюки кулаки та імперыялісты так не ждуть».

Калгасьніца, вядома, мела рацыю, яны—наша ворагі—не стаяць на адным месцы, яны рыхтуюць напад на нас, яны рыхтаваліся да зьнішчэньня нас, да зьнішчэньня ўлады рабочых і сялян, да вяртоту памешчыкаў і капіталістаў. І [illegible]ны, разьлічыўшы свае сілы, гэтаму [illegible]ну кулакоў, інтэрвентаў, шкоднікаў [illegible] прыпрастаўлі свой плян, плян [illegible]ваньня ў нас кулакоў, шкоднікаў і ашчага капіталістычнага асвосьці. Мы рушыліся ў атаку супроць рэшткаў капіталізму, супроць спекулянтаў, супроць кулакоў.

Усе мы памятаеце, як гэта пачалося. Злашэрны бок справы палягае ў тым, што мы пачалі праводзіць у 1928 годзе абобшэствагоўку, бяльмітэнне разьбіваючы супраціўленьне кулацтва, а яно тады ў вёсцы мела сілу. Беднота, батракі і пераважная частка сераднякоў у гэтай барацьбе на нашым баку.

Партыя пачала з таго, што арганізавала гэтыя сілы для таго, каб перакінуць кулака на лініі збожжазагатовак, потым, разгарнуўшы работу сярод мас працоўнага сялянства, перакуліць ворага і па лініі калектывізацыі, ручыць машыны ў вёску, але даць іх не кулаку, а калгаснікам. І мы, пачынаючы з 1928 г., сталі паволна, але верна прасоўвацца наперад. І тут, таварышы, былі свае затрудненьні. Вось некаторыя глядзяць ходу калектывізацыі. У 1928 г. у нас было на 1 лістада 33 тысячы калгасаў, а ў іх 416 тысяч двароў, г. зн. амаль 2 проц. У 1929 годзе, праз год, у нас было ўжо 57 тыс. калгасаў, амаль 3,9 проц., у тым-жа 1929 годзе ў кастрычніку мы сеялі ў нас было 4,1 проц., а 20 студзеня 1930 г. у нас ужо было 21 проц., 10 сакавіка 1930 г. мы атрымалі 106 тысяч калгасаў, амаль 15 мільёнаў калгасных двароў, 58 проц. калектывізацыі. Вялося, такая вялікая справа не абышлася без буйных памылак, перагібаў і захапленьняў.

На месцах некаторыя нашы таварышы захапіліся стыхійным рухам, забеглі наперад, папусьцілі перагібы, кінуліся, страціўшы галаву, наперад і атрымалася галавакружэньне ад посьпіхаў. Так шчэна гэта нязкаў т. Сталін у сваім артыкуле, у якім ён рэзка асадзіў зарвацца адміністратараў. Класавы рух бурна разьвіваўся. Паволны ўдзьм, поўны скачок, перабой. Гэта адбівала ў сабе шмат некаторых, нашна пяўменьне добра арганізаваць справу. У сакавіку мелі 58 проц. калектывізацыі, а ў красавіку мы мелі ўжо толькі 37 проц., потым у мае—28 проц., у лістадзе—24 проц., а ў верасьні—нават 21 проц.

З 58 да 21 проц. Некаторыя людзі, якія шмат ня любілі і нехацелі калгасаў і былі супроць калектывізацыі, злосна рагаваліся. Яны шукалі ў гэтым шматзначэньні правільнасьці сваёй выступленьняў супроць калектывізацыі. Яны гаварылі: «Ага, ня выходзіць, мы маем рацыю: калгасны рух ня масавы, а штучны».

Партыя на гэта ім адказвала з ленінскай цьвёрдасьцю і ўкарга вялі сваю палітыку калектывізацыі. Тым людзям, якія гаварылі: «Урадзкай кепскі, калгасы распадаюцца, атрымліваецца адліў, разгортваньне калгаснага руху няправільна», гэтым людзям партыя адказвала: дарамна, галубчыкі, радуецеся, вы не разумееце таго, што калгасны рух насьпеў гістарычна, што хочаш ці ня хочаш, а выхад толькі ў калгасе, сьветлую будучыню селяніна можа знайсьці толькі ў калгасе, толькі ў калгасе ён можа знайсьці поўнае ажыцьцяўленьне ўсіх плёнаў і ўсіх рэзультатаў сваёй вялікай шматвяковай барацьбы ад сярэдніх векаў да кастрычніцкіх дзён. **(Аплёдысмэнты).**

І тут, на зьезьдзе калгаснікаў-ударнікаў, падводзячы вынікі калгаснага руху, я паінен асобна падкрэсьліць: саму належыць найвялікшая заслуга таго, што ў гэты момант многія з камуністаў не шарахнуліся з адной крайнасьці ў другую?

Саму належыць найвялікшая заслуга таго, што, з аднаго боку, быў паказан шлях патрэбжаньня, шлях барацьбы з адміністрацыйным перагібам, а з другога—паказана неабходнасьць самай уважлівай падрыхтоўкі для правядзеньня калектывізацыі? Чаму? Хто арганізаваў глыбокае вораньня для пасьпяховага разгортваньня масавай калектывізацыі?

Найвялікшая заслуга ў тым, што наш калгасны рух пашоў па правільным, здаровым рэчышчы, што ён быў накіраван па верным шляху, належыць першаму ўдарніку-калгаснікам тав. Сталіну. (Бурныя аплёдысмэнты).

Пасьля верасьня 1930 г. пачаўся пералом. У сакавіку таго-ж 1930 году мы мелі ўжо 24 проц., потым у студзені 1931 г.—26 проц., потым у сакавіку—35 проц., на 1-е кастрычніка 1931 году—61 проц., 1-га кастрычніка 1932 году—60,8 проц. і на 1-е студзеня 1933 году—62,4 проц. Калектывізацыі ў асноўным у рэшткі раёнах закончана, і цяпер мы моцна і цьвёрда стаім на нашай савецкай калгаснай глыбі. **(Аплёдысмэнты).**

Індустрыялізацыя і дапамога дзяржавы забясьпечым перамогу калгасаў

Чым-жа тлумачыцца, таварышы, што нам удалося ў кароткі тэрмін паставіць калгасны рух на моцныя ногі? Гэта тлумачыцца тым, што ў «гісторыі чалавецтва ўпяршыню зьявілася на сьвеце ўлада, улада саветаў, якая дказала на справе сваю гатоўнасьць і сваю здольнасьць аказаць працоўным мазам сялянства сы стматыўную і працяжную **вытворчую дапамогу» (Сталін—«Пытаньні ленінізму», 3 выданьне. стар. 539).**

Гэта дапамога аказвалася і аказваецца трактарам, снабжэньнем беднякоў і сераднякоў-калгаснікаў вёскі машынкамі, трактарамі. За 4 гады пяцігодкі пралетарская дзяржава дала сельскай гаспадарцы больш 120 тыс. новых трактараў. А памятаеце, Ленін гаварыў, што калі-б мы мелі 100 тыс. трактараў, дык мы тады-б разгарнулі справу так, што кожны селянін-працаўнік сказаў-бы: «я за камунію, я за савецкую ўладу», а гэта значыць, што ён за калгасы, што ён за кіраўніцтва пралетарыяту і яго камуністычнай партыі. А цяпер, выканаўшы пяцігодку за чатыры гады, мы далі за гэты час, за чатыры гады (нават-жа рабочы конь за гэты час ня, вырасьце як ольсд), мы далі больш **120 тыс. трактараў сельскай гаспадарцы і на 1.600 млн. рублёў розных сельска-гаспадарчых машын.**

У пасьляўнымі з 1928 годам машынная ўзброенасьць сельскай гаспадаркі падвоілася.

Камуністычная партыя і савецкая ўлада зыходзілі з таго, што без машын, без эканамічнай дапамогі з боку гораду нельга перабудаваць нашу вёску. Вось чаму, таварышы, мы разьвялі нашу сацыялістычную прамысловасьць. Многіе не зразумела было спачатку, чаму-ж будуюць Дніпрабуд, Краснапуціловскі, Сталінградскі, Харкаўскі, Чалябінскі трактарныя заводы, чаму мы будуем металургічныя заводы—Магнітагорск, Кузьнецк буд. Але, таварышы, зараз кожны селянін разумее, што без жалеза, сталі і машын мы вярнуліся-б зноў да старой дзедаўскай тэхнікі, мы зноў сталі-б у залежнае становішча ад імпэрыялістаў Англіі, Францыі, Амэрыкі, Германіі.

Без жалеза і сталі краіна—не краіна, а цацка ў руках імпэрыялістычных драпежнікаў. Вазьмеце, напрыклад, Кітай. Там ёсьць тэкстыльныя фабрыкі, ёсьць і розныя іншыя фабрыкі, ёсьць рабочыя, але ў Кітаі не вырабляюць метало, сталі, машын і, значыцца, ня могуць вырабляць гармат, аэраплянаў, танкаў, каб абараніць сваю незалежнасьць. Там няма сваёй індустрыі. Усё, што патрэбна з машын, усё гэта ўвозіцца з заграніцы. Чаго варта такая краіна, падаць з таго, як імпэрыялісты зьдзекуюцца зараз над Кітаем.

Аб адзіноўнымі сельскай гаспадарцы нельга было і думаць без машын, бяз індустрыі і ў першую чаргу бяз цяжкай індустрыі, бяз вырабу метало і машын. Ясна, вядома, што кулак, спекулянт, спэцкаўленьні ў адпаўленьні капіталізму, ня хочуць і слухаць аб разьвіцьці індустрыі, бо гэта нясе ім перамогу і хутчэй пагібель. Яны хацелі-б, каб багацьці нашай краіны, што ляжаць у нетрах зямлі, нашна золата, медзь, срэбра, сьвінец, руда, вугаль, якія капырыны па ўсёй неабсяжнай нашай краіне ў вельмі вялікай колькасьці, каб усё гэта было аддана **ў канцэсіі замежнаму капіталу.** Пры дапамозе замежных капіталістаў нашы класавы ворагі ўгутры краіны спадзяваліся адпавіць улаву памешчыкаў і капіталістаў. Але ня тут-та было. У капіталістаў у самім шмат супярэчнасьцяй, у іх у самім усё трашчыць па ўсіх швах. І галоўнае—нашы рабочыя і сяляне за вялікі ўладу не для таго, каб аддаць потым нашу краіну на разграбленьне замежным капіталістам, адпавіць упутранных капіталістаў, хаця-б новае пры пыньзе—савецкая, моў, улада. Часова-то шыльда застанецца для фірмы, а потым і шыльду зьмяначаць, і бальшавікоў загубяць, і рабочых задушыць, і сялян жорстка ўціскаць і шалёна эксплёатаваць будуць.

Што мы маем у рэзультаце выкананьня пяцігодкі за чатыры гады? Колькі мы ўклалі ў прамысловасьць і ў сельскую гаспадарку? Некаторыя пытаюцца: дзяжка, моў, вам прыходзіцца. Так, трацкісты ёсьць, не адмаўляемся. Класавы ворагі шкодзяць. Ёсьць трудзнасьці росту, трудзнасьці клясавай барацьбы. Падумайце толькі, нам-жа прыходзіцца будаваць самім, не атрымліваючы ніадкуль капіталаў і дапамогі. А ў народную гаспадарку проба было ўкласьці ці вялізарныя сродкі. Колькі мы ўклалі,—гэта павінен ведаць кожны калгаснік, кожны селянін. За гады пяцігодкі **мы ўклалі ў прамысловасьць 23 мільярды 300 мільёнаў рублёў.** Больш чым 23 мільярды, і ў тым ліку **на цяжкую прамысловасьць** 20,1 мільярд., з іх 3,5 мільярд. рублёў укладзена ў машынабудаваньцтва, прытым толькі ў прамысловасьць, выробляючую машыны для сельскай гаспадаркі, укладзена 920 млн. Колькі ўкладзена за гэтыя 4 гады ў сацыялістычны трактар **сельскай гаспадаркі? 15 мільярд. 700 млн. рублёў,** з іх 12 мільярд. 700 млн. за кошт дзяржавы, у тым ліку 9 мільярд. 400 млн. капітальных укладаньняў. Гэта—сума, якой капіталістычныя краіны ня ведалі. Параўнайце, капіталіст бярэ ў рабочых, ён рабуе сяляні і кладзе гэта сабе ў кішэню, пераварвае ў сваю **прыватную** ўласнасьць, пыкуе, расграньвуюе, у нашай дзяржаве кожная рабочая і сялянская капейка, якая ідзе дзяржаве, ідзе ў справу, ідзе ў гаспадарку, ідзе на тое, каб павялічыць рабоча-сялянскае жыцьцё. У ліку гэтых укладаньняў дзяржава ўлажыла затраціла на куплю новых сельскіх машын заграніцай. Гэтыя машыны гэтай было купіць на што [illegible] ні стала. І больш за ўсё, гэта сама машынна для таго, каб пад самім пры іх дапамозе выдабываць новыя машыны. У гэту справу не пакідаюцца грошы, нават золата. І ўрэшце на маскоўскіх заводах і зіньгрэдзе, якія гэта складаныя, рэмонтныя машыны. Гэтыя разумныя машыны самі ўсё робяць. Трэба было гэтыя машыны купіць. Бяз іх мы ня можам далей разьвівацца. Бяз іх нельга выпускаць машын для сельскай гаспадаркі. Купіць іх можна толькі на золата. Апрача золата, якое мы здабываем у канальных, трэба дапаўкова вывозіць і прадаваць нафту, бензыну, пушніну, лес і пэўную колькасьць сельска-гаспадарчых прадуктаў. Сёй-той думае, што гэта ня трэба. А клясавыя ворагі, карыстаючыся гэтым, стараюцца правесьці сваю агітацыю супроць індустрыялізацыі. Знаходзяцца падкулачнікі, якія слухаюць і падхапляюць гэту кулацкую агітацыю і, перашкаджаюць справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы затрацілі на абсталяваньне нашай цяжкай індустрыі паўтара мілярда рублёў валютай. Увоз с.-г. машын і ўтнасьньня склаў 378 млн. руб. золатам, а пікада, вразумела, наша рабоча-сялянскае золата даваць капіталістам. Але, купляючы ў іх гэтыя машыны, ведаем, што гэтымі машынамі мы перабудуем нашу краіну, потым перабудуецца і ўвесь сьвет так, што, як пісаў Ленін, настуціць час, калі з золата будзем уборныя будаваць **(сьмех).**

У першыя гады пяцігодкі, калі на нашы заводы яшчэ не выраблялі сваіх трактараў, мы купілі ў Амэрыцы трактары. На калгасных і саўгасных палёх часта можна сустрэць на тых трактары СТЗ, «Красного путиловца» і Харкаўскага заводу, але і розныя Ойльтуль, Дзоцдзір, Катэрпілер. Гэта ўсе розныя амэрыканскія маркі і прозьвішчы ўласьнікаў заводаў, што выробляюць трактары. Цяпер яны апрацоўваюць нашы сацыялістычныя палі. Але за гэтыя трактары і за розныя іншыя машыны мы заплацілі 378 млн. руб. золатам, апрача мільярда, укладзеных непасрэдна ў сельскую гаспадарку.

Апрача гэтага. Заграніцай мы закупілі машыны і для іншых галін народнай гаспадаркі.

Вось, таварышы ўдарнікі калгасаў, вам справаздача аб тым, **куды ўрад рабочых і сялян траціў і траціць працоўныя рабоча-сялянскія капейкі.** За гады пяцігодкі пабудаваны шмат вялікіх заводаў для выробу сельскагаспадарчых машын. Вось пабудавалі Саюзсельмаш у Растове, буйнейшы завод, затрацілі мы на яго 298 млн. руб. Пабудавалі Сталінградзкі трактарны завод, затрацілі на яго 127 млн. руб., з іх 35 млн. руб. золатам; Харкаўскі трактарны завод — 121 млн. руб., з іх 19 млн. руб. золатам; Чалябінскі трактарны—155 млн. руб., з іх 18 млн. руб. золатам; «Красный путиловец» па трактары адпал—415 млн. руб., «Шарыкопадшыпнік» —72 млн. руб., у тым ліку золатам 21 млн. руб.; аўтазавод імя Сталіна толькі золатам затрачана 24 млн. руб.

Такім чынам, вы бачыце, што наша савецкая дзяржава вырасла, умацавалася і яна сур'ёзна па-сапраўднаму вытворча, машынамі і капіталамі дапамагае сельскай гаспадарцы, калгаснаму сялянству перабудоўваць сваё жыцьцё па-новаму.

Машына мяняе твар вёскі, у барацьбе стварацца новыя людзі. Ня ўсе машыны мы выраблялем у вялікай колькасьці, але няма такой машыны, якой мы ня можам рабіць.

Я пералічаю падрабязна, якія і колькі машын мы далі вёсцы. Па гэтым сьпісе вы можаце пераканаць, што значыць **сытворчая дапамога** пралетарыяту сацыялістычнай прамысловасьці нашай, вёсцы, нашаму калгасу, сялянству.

Якія машыны даны і якія працуюць у нас новых сельгасмашын? Трактараў «Красный путиловец», СТЗ, ХТЗ, трактараў усіх відаў марак дана за ўвесь час, уключаючы і тое, што далі да пяцігодкі,—150 тыс.

Хутка ўступіць у строй Чалябінскі завод магутных вусеніцных трактараў.

Трактарных плугоў—Раўсельмашу, Сібсельмашу і заводу Кастрычніцкай рэвалюцыі 2-3-4-5-корпусных і 8-лемешных лушчыльнікаў выпушчана 1931 і 1932 г. г. звыш 150 тыс. штук.

Трактарныя сяялкі 19-радковыя і дысавыя 24-радковыя—заводаў імя Сталіна ў Растове-на-Дону і «Красная зьвезда». **Працуюць** адной сеялкі—18 га. Работа сеялкі за адзін дзень замяняе 1) 6 ручных сеялбітаў і эканоміць 50 пудоў збожжа, або 2) 6 конадзён і 6 чалавекадзён. **Выпушчана за два гады 60 тыс. штук.**

Матыг — «Украінка» (цярпамайскага заводу ў г. Бярдзічаву) для міжрадной апрацоўкі цукровых буракоў. Для трактара стаіць тры разам. Працуюць адной матыгі—8-10 га. Замяняе 50 жаночых рабочых дзён. За два гады выпушчана 14 тыс. штук.

Трактарныя і конныя бульбасадзілкі (4-радныя) заводу «Красный плуг». **Працуюць** трактарнай —8-10 га за дзень. Работа бульбасадзілкі за дзень замяняе аднаго рабочага каня, 50 жаночых рабочых дзён. **Выпушчана** у 1932 г. трактарных 243 шт. і конных 10 тыс. штук.

Ільнацерабілкі «Камсамолка» (Любярэцкага заводу каля Масквы). **Працуюць:** 25-30 га за дзень, замяняе 50-100 чалавекадзён. **Выпушчана** за 1931 і 1932 г. каля 15.000 штук.

Трактарныя малатарні (заводаў «Серп і молат» у Харкаве і «Камунар» **Працуюць** ад 1.500 да 1.800 пудоў збожжа ў дзень, г. оп. у 4 разы больш, чым 4-конная малатарня. Замяняе 20 конадзён і 30 чалавекадзён. **Выпушчана** звыш 20 тыс. штук.

Збожжавыя камбайны (Растсельмашу, «Камунару» і Сарата́ўскага заводу). **Працуюць**—15 га за 10-гадзінны рабочы дзень. Замяняе 4-5 конных жнівараак, 2 конныя малатарні або 18 конадзён і 30 чалавекадзён. **Выпушчана** за 2 гады 13.500 штук.

Кукурузны камбайн двухрадны «Пікер» (заводу «Красный Аксай»). **Працуюць**—7-8 га за дзень. Замяняе 70-80 жаночых рабочых дзён. **Выпушчана** 2.200 штук.

Кукурузная малатарня (заводу «Красный плуг») для абмалоту кукурузных початкаў. **Працуюць** —800-1.000 пудоў у дзень. **Выпушчана** звыш 1.400 штук.

Бульбакапальнік (заводамі Разанскага, Віцебскага, «Чырвоны металіст» і імя Арцёма). **Працуюць** —2 га за дзень. Замяняе паробку ў жаночых рабочых дзён на 20-50 проц. Выпушчана каля 37.000 шт., у тым ліку трактарных 500 шт.

Буравых камбайнаў (завод «Плуг і молат»). Гэта машына мяханізуе ўборку цукровых буракоў, абрэзае бацьвіньне, выкопвае і зачышчае ад зямлі карэньні і складае ў кучу бацьвіньне і карэньні. **Працуюць** —5 га, замяняе 50-70 жаночых рабочых дзён.

Пнэўматычныя бязбоўнаўборачныя машыны «Турмак», «Вакуум» (заводу імя 1-га мая ў Белай Церкві). Пры значнай для 1-га і 2-га збору бавоўны. **Працуюць** збору 2.940 пудоў бавоўны ў дзень. **Выпушчана** звыш 300 штук.

Машына нясе з сабой у вёску новае, небывалае. Машына мяняе твар вёскі. Яна зьмяняе абстаноўку вакол чалавека. Яна перабудоўвае яго, мяняе яго настрой, робіць яго больш рухавым, эмоцыянальным, культурным.

Мы яшчэ дрэнна з машынай абыхо дзімся. У нас мала вецэў, не хапае культурнасьці. Але як толькі мы навучымся ад гэтай машыны, сьветлым і бадзёрым стане жыцьцё мільёнаў на шлях сялян.

Як бачыце, мы набліжаемся і ў далейшым набліжаемся таго, каб калгасы далі поўнае жыцьцё селяніну, каб яны прынесьлі сапраўды тую карысьць, якую яны могуць і павінны прынесьці.

Што можа і што павінна, у канчатковым разрахунку, даць калгаснае будаўніцтва вёсцы? Чаму мы павінны, разгортваючы сацыялістычнае і ўдарніцкае, дабіваецца ўсяверагага палепшэньня і ўмацаваньня калгасаў, большай працоўнай дысцыпліны там? Чаму, а таму, **па-першае,** што калгасы павінны палепшыць жыцьцё працоўных, **канчатковa** зьнішчыць, падзел на заможных і незаможных, зьнішчыць зьбяднеьне ў вёсцы. Загадаю гэтага ня зьнішчыш. Гэта можна зрабіць толькі ў рэзультаце вымяненьня самой сутнасьці вытворчага жыцьця ў вёсцы. Гэта мы зрабілі, пачынаючы разьвіцьцё вёскі па **сацыялістычны шлях. Па-другое,** калгасы даюць магчымасьць шляхам самата **шырокага ўкараненьня ў сельскай гаспадарцы новых сучасных сельска-гаспадарчых машын значна ўзьняць працуючы насьць працы ў сельскай гаспадарцы.**

Па-трэцяе, калгасы могуць самым лепшым чынам ўлічыць грамадзкую выгаду для калгаснікаў калектыўнай гаспадаркі з яго сялібнай гаспадаркай, якая дотуе асобна ў колькага калгаснікаў, т. зн. іншым словам, **з яго асобістым інтарэсам.**

Па-чацьвертае. Калгас можа і павінен **палегчыць** працу селяніна і сял

Працяг дакладу тав. Л. М. Кагановіча

У прамысловасьці мы паставілі кусце. У прамысловасьці-ж таксама ёсьць недахопы, самі аб гэтым гаворыце. Вы самі гаворыце, што пастаўлена на належную выпушчэ 200 тыс. калгасаў справа цяжкая і складаная». Гэтыя бюракраты і апартуністы стараюцца ўтаіць свае недахопы за агульнымі труднасьцямі, якія, моў, ад іх не залежаць, прыкрыцца, як ка жуць, аб'ектыўнымі труднасьцямі. Трэба біць на два фронты.

На студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК з аднаго боку, стаялі вялікія склады т. т. Сталіна, Молатава і Куйбышева аб вынках пяцігодкі. Былі паказаны шэпы найвялікшыя перамогі. А на другі дзень у тэй-жа самай залі, з тэй-жа самай трыбуны, тав. Сталін выступіў з прамовай, у якой разбіраў проста па костачках слабасьці нашага кіраўніцтва ў калгасах. І паставіў пытаньне аб іх ня толькі перад усёй нашай краінай, але і перад усім сьветам.

Наша большавіцкая партыя, на чале з тав. Сталіным не баіцца ўскрываць шэпы недахопы. Няхай амерыканскія, францускія, ангельскія, германскія капіталісты цешаць сябе, раздуваючы шэпы недахопы. Мы-ж сумленна і проста ўскрываем іх перад сваім народам. Мы ўказваем на шэпы галачкі і заклікаем рабочых і сялян дружна разам іх лячыць.

З чаго-ж мы павінны пачаць выпраўляць шэпы недахопы і ў сельскай гаспадарцы; **мы павінны пачаць з веснавой сяўбы.** Армія загартоўваецца ў баёх. Адзін дзень вясной страчаны—гэта значыць ограніць чорт ведае колькі. Кожны селянін ведае гэта.

Якасьць работы калгасаў залежыць ад нас саміх

Большасьць з вас добра ведае калгаснае жыцьцё. Мы ў гэтых адносінах павінны вучыцца многаму ў нас. Нельга думаць, што вы прыехалі сюды да нас толькі вучыцца. Не, тав. Ленін і тав. Сталін ня раз гаварылі, што майстэрства трэба заключаецца ў тым, каб кіраваць, вучыць і адначасова вучыцца ў мас.

Калі добра разабраць і прадумаць агульныя ўражаньні ад асабістага азнаямленьня і вывучэньня на матар'ялах нашых калгасаў, то ўсё больш пераканаемся, што якасьць іх работы цалкам залежыць ад саміх калгаснікаў і іх кіраўнікоў. Усе умовы для шасьнаховага разьвіцьця калгасаў савецкай уладай створаны.

Зразумела, розныя ёсьць калгасы і сярод добрых. Розныя ёсьць паказальнікі. Нельга сказаць, што ўсе добрыя калгасы аднолькавыя. Ёсьць добрыя, ёсьць зешныя, або, як у школе гаворым, ёсьць па пяць з плюсам, ёсьць па пяць з мінусам, ёсьць па чатыры з плюсам і г. д., да нуля скочваюцца.

Якава карціна стану добрага калгасу? Чым характарызуецца яго работа? Некаторыя адзьніваюць калгас толькі па колькасных паказальніках: у яго ёсьць столькі-та пасеву, столькі-та коняй, столькі-та кароў, значыць калгас добры. Але мы павінны ацэньваць калгасы ня столькі колькасную яго маемасьці, колькі якасьцю яго работы. І перш за ўсё правільным вядзеньнем гаспадаркі, гаспадарскім вокам. Я бачыў маленькі калгас, ён яшчэ не багаты — калгас Шаблёўскага сельсавету, Сальскага раёну. Але калгас становіцца на ногі. Справа ў яго пастаўлена з самага пачатку правільна. Калгас забясьпечвае калгаснікаў і грашыма, і харчамі і выканаў усе дзяржаўныя абавязацельства. Ён забясьпечыў коняй і кароў кармамі, мае цьвёрды плян, умее арганізаваць сваіх калгаснікаў так, каб калгаснікі працавалі ў калгасе ўсёй сваёй душой.

Зойдзеш на стайню добрага калгасу і адразу бачыш гаспадарскае вока. Стайня ацеплена, чысты подсьціл, коні чыстыя, галака змачваецца гарачай вадой, дзецца сечка з саломы. Лішняя справа ў дрэнным калгасе. Заяўляюць, што ў іх нават гарачай вады, каб змачыць, галаву, няма. А правільней — няма людзей, якія-б балелі за калгаснае дабро.

У добрым калгасе карыты моцныя, корм не вываліваецца з іх. Гэта ведамі важна. Вы ня думайце, што трэба адхіліць, адкінуць усё, што рэбіў стары гаспадар. Мы замяняем прыватную ўласнасьць грамадзкай калгаснай уласнасьцю, мы прыватнаўласьнікі-селяніна аб'ядналі ў калгасы. Але ў гаспадарчага адносьніна было шмат карыснага, калгас мог-бы і зараз выкарыстаць. Д... калгаснікі так і робяць.

Мне прышлося быць у добра падрыхтаваным калгасе «Кэл Буруп» у Кабардзе. Вялізарныя калгасныя хлявы і стайні, пядаўна пабудаваныя на чыстым полі. Інвэнтар ужо разьмяркаван па брыгадах, ляжыць пабрыгадна ў трысьцёнях, плугі павернуты даверху, усе с.-г. прылады змазаны яшчэ з восені, абаронены ад сьнегу і не іржавеюць. А ў дрэнным калгасе другая карціна. Сельска-гаспадарчыя машыны ляжаць над сьнегам у дзіравым хлеве, плугі заіржавелі, ня змазаны, бораны не падрыхтаваны, хамуты не ў парадку. Адразу відаць, як такі калгас не па-гаспадарску рыхтуецца да вясны.

Пытаюся аб пляне веснавых работ у некаторых калгасаў. За колькі дзён думаюць яны правесьці веснавую сяўбу? Добры калгас адразу адказвае: думаем у дзесяць-пятнаццаць дзён. А ў дрэнным калгасе нават пляну яшчэ няма, ён нават зямлю яшчэ наміж брыгадамі не разьмяркаваў. Такіх пры кладаў можна прывесьці вельмі многа.

Узяць у большасьці калгасаў пастаўлен вельмі дрэнна. Я бачыў шмат добрых калгасаў, якія маюць ся дрэнную гаспадарку, але ва ўліку працадзён, па ўліку сваёй гаспадаркі, у складаньні пляну яшчэ вельмі кульгаюць. І пераважна кульгаюць ня столькі з-за малапісьменнасьці, колькі з-за крайняй даверлівасьці нашых людзей да так званых рахункаводаў, бухгалтароў. Вялізарная частка гэтых калгасных вучотчыкаў, бухгальтароў, рахункаводаў, — людзі, якія рахункаводствам школі не займаліся. Частка з іх палезла ў вёску таму, што марыць паогул пажыць бяз клопату, далей ад прамысловых цэнтраў, дзе іх можна лягчэй выкрыць. А частка палезла ў вёску для таго, каб там падрываць калгасы, для таго, каб там падрываць савецкую ўладу.

Ахова калгаснай маемасьці ў добрым калгасе пастаўлена як сьлед. Нічога ня гніе, усё на замку. А вось прыяжджаеш у дрэнны калгас, як, напрыклад, у станіцы Нова-Цітраўскай, і бачыш, што ў сьвіране ляжыць збожжа без замка. «У нас, кажуць, ёсьць вахтаўнік». Але-ж вахтаўнік можа прамігаць, таму, што сьпрыцаў многа, а ён адзін, а па-другое ён сам можа красьці і спакушаць яго на вар та. Ня ўсе людзі могуць перад грэхам устаяць.

У адносінах працадысцыпліны мы маем вельмі многа хібаў нават у добрых калгасах. Нашу працадысцыпліну не арганізуеш толькі тым, што будзеш упрошваць чайсьці працаваць, або толькі тым, што загад напішаш. Нашу працадысцыпліну трэба стварыць упартай барацьбой і работай са ня ў дзень, з гадзіны ў гадзіну над перароблкай псыхалёгіі. Раней, калі пяпоранні калгаснік быў аднасобнікам, усе яго імкненьні, зацікаўленасьць, як кажуць, стымул да працы грунтаваліся на тым, каб больш зрабіць для таго, каб больш атрымаць на рынку. У калгасе матар'яльная зацікаўленасьць у рабоце застаецца поўнасьцю, але яна носіць іншы характар. Мы-ж і калгасы арганізавалі, выходзячы з інтарэсаў сялянства. І селянін пайшоў у калгас, выходзячы з сваіх непасрэдных інтарэсаў. Вядома, зацікаўленасьць калгасьніка, гэта імкненьне больш атрымаць на працадзнёх, атрымаць больш грашыма, збожжам, натурай. Атрымае больш калгас і ён больш па працадзнёх атрымае. Але ня ўсе пасьпелі ўсьвядоміць гэту сваю зацікаўленасьць. Ёсьць калгаснікі, якія яшчэ глядзяць на калгас, як на справу і сваю і як-бы чужую. Мне давялося ў адным калгасе гаварыць з калгаснікам-арыгінарам, кіраўніком стайні калгасу. Я пытаюся яго: «скажы, ці лепш, у аднасобнай гаспадарцы, ці зараз? Атрымалі-ж вы па працадзнёх добра». Ён мне адказвае: «яно, вядома, зараз лепш. Гэта бясспрэчна. Але пеяк я раней як-бы сам сабе гаспадаром быў, а цяпер я не гаспадар». Тут-жа стаялі і другія калгаснікі. І вось адзін стары калгаснік, выступіўшы рэзка супроць яго, кажа: «Які ты раней гаспадар быў. Раней ты меў аднаго дохлага коніка і думаў, што быў вялікі гаспадар. А цяпер цябе назначылі брыгадзірам над 20 конямі. Дагляд іх, твая гэта справа. Ты цяпер ня тое, што аднаасобны над дохлым конікам гаспадар, ты цяпер «вышэйшы» гаспадар, калгасны гаспадар».

У станіцы Ціманоўскай на Кубані скардзіліся, што, бачыце, у іх быў быццам-бы неўрадлікай ад «захвату» туману. Я спытаў аднаго старога казака: «Як-жа, дзядуля, з захватам стаіць справа?» — Ды як, захват быў, гэта правільна, але не вялікі. Ня ў ім справа параўнайце вас і мяне. Мне 70 год, я на нагах ня моцна стаю і рука ў мяне баліць, я хворы, а вы малады і здаровы. Калі мяне штурхнуць, я адразу павалюся, а калі вас штурхнуць вы па нагах утрымаецеся. Таксама і з ураджаем. Калі зямля добра заарана, свалчасова засеяна, усе сельска-гаспадарчыя работы добра праведзены, тады, нават калі будзе захват, то ўраджай магчыма крыху зьменшыцца, але ўсё-ж будзе ня кепскі. А калі дрэнна заараць, позна засеяць, калі дрэнна апрацаваць, калі пустазельля шмат, ня выталалі яго ў свой час, а тут яшчэ захват, то з ураджаем атрымліваецца тое самае, што са мной, ураджай таксама ўпадзе, як я ўпаду, калі мяне штурхнуць». Вось у чым мудрасьць. Вядома, прыродныя ўмовы маюць уплыў, але добрай рабо тай мы можам застрахоўваць сябе, бо калгас-жа значна лепш можа абараніць ад стыхійных бядот, чым аднаасобнік.

Калгас дае прасторы для работ, ня лікія магчымасьці праяўць сябе тым талковым старанным калгаснікам, якія раней, калі былі аднаасобнікамі, пры сваёй старанпасьці не маглі праявіць сябе, выйсьці з галечы. Бывала так пры капіталізьме, у старыя часы: руку прыкласьці можа, найстаранейшы чалавек, жонку мае баявую, але няма зямлі. Зямлю дастаў — каня няма, каня дастаў — плуга добрага няма. Таго няма, другога няма, б'ецца чалавек з году ў год. Сябе, сям'ю замучыць. А карысьці ўсё няма. А што сёньня? Сёньня ў нас ўсё інакш. Сёньня мы маем усё неабходнае, каб калгаснік жыў добра. Зямлю калгасы атрымалі апрача 120 млн. га зямлі, атрыманых у рэзультаце Кастрычніцкай рэвалюцыі ад памешчыкаў, казны і пераразьмеркавання кулацкіх земляў пераходна пасьля 1917 году. Бядняцка-сярэдняцкія гаспадаркі, абзямленыя зараз у калгасы, за апошнія 3-4 гады павялічылі ў паўтары разы сваю пасеўную плошчу — з 63 млн. га ў 1929 годзе да 92 млн. га ў 1932 годзе (а ў 1913 годзе яны засявалі ўсяго 31 млн. га, г. зн. у тры разы менш, чым зараз). Павялічэньне пасеваў калгаснага сялянства за апошнія 3 гады адбылося за кошт кулацкіх земляў — каля 12 млн. га, асваеньне цэлінны — 9 млн. га і пераразьмеркаваньне зямель паміж калгаснікамі і аднаасобнікамі — 8 млн. га.

Канкрэтныя задачы калгасаў па важнейшых відах сельгасработ

Дазвольце мне больш падрабязна спыніцца на задачах калгасаў па асобных відах с.-г. работ.

Перш за ўсё некалькі слоў скажу аб зямляўпарадкаваньні. Раней у нас было малазямельле, далёказямельле, драбнаткая гаспадарка, цераскалосіца. Цяпер зямля адведзена калгасам і галоўная справа — правільна разьмер казаць яе ўнутры калгасу па брыгадах і палёх севазвароту.

Брыгадзе трэба адвесьці пэўны вучастак зямлі. А які вучастак адвесьці? Жывуць брыгадзіры, дапусьцім у адным канцы вёскі, па адным акраіне, а даюць ім працаваць на другой акраіне. Магчыма лепш зрабіць так, каб атрымалі зямельны вучастак бліжэй да месца жыхарства. Для вялікіх вёсак на Паўночным Каўказе, на Украіне, у ЦЧВ, якія цягнуцца па некалькі кіёмэтраў, гэта вельмі важна.

Або тое, што мы называем севазваротам. Пры трохполцы адна трэцяя зямлі прападала, знаходзілася над парам. Цяпер мы можам і павінны пабудаваць севазварот так, каб было больш збожжавых і больш розных культур, а таксама, каб ня сеяць жыта па жыце. Трэба ўмела арганізаваць севазварот, каб зямля ня гінула і жыта па жыце ня сеялася. У нас вельмі шмат было такіх выпадкаў, калі калгас падзяліўся, падзялілі і зямлю, і зноў пачалі сеяць жыта па жыце. Улік папярэдніх культур пакаэнкрэтных вучастках не вядзецца.

Справа севазвароту дрэнна вялася ня толькі таму, што мы самі яго дрэн на вялі, але і таму, што тут шкоднікі прыложылі сваю руку. Шкоднікі не хацелі, каб мы ўводзілі севазварот. А там, дзе севазварот уводзіўся, яны рабілі так, што зьменшыліся пасевы збожжавых, чаго мы ці калгаснікі, ні дзяржава, дапусьціць зусім ня можам.

Мы павінны зараз аддаць больш увагі справе севазвароту і разьмеркаваньня вучасткаў зямлі ўнутры калгасу яшчэ і таму, каб не перагружаць паасобныя брыгады рознастайнымі культурамі. Ёсьць раёны, у якіх у калгасах і слапэчнік, і бураў, і вялізарная колькасьць іншых тэхнічных працаёмкіх культур, якія патрабуюць вялікай работы для праполкі.

З чаго пачаць падрыхтоўку да вясны? Ясна, па-першае, з таго, каб падрыхтаваць і разьмеркаваць вучасткі зямлі па брыгадах. Потым падрыхтаваць пасеньне. **Насеньне трэба сабраць.** І ня толькі сабраць, але трэба зьвярнуць увагу і на якасьць пасеньня. «Ад дрэннага семя не чакай добрага племя». Тут ідзе таксама барацьба. І ня трэба ўтойваць. Мы маем шмат выпадкаў раскрадваньня насеннага збожжа. Задача заключаецца ў тым, каб ня толькі сабраць пасеньня, але і правеяць яго, пратрасьціць, праверыць па ўсхожасьць. Усё гэта мае вялікае значэньне. Больш таго, трэба памятаць нават такія дробязі, як, напрыклад, пасьля пратручваньня пасеньня высушваць яго. Калі яно пратручваецца вільготным спосабам і яго ня высушваць, то ў рэзультаце паміжаецца ўсхожасьць пасеньня. Ва ўсё гэта, у кожную дробязь трэба ўваходзіць і ўваходзіць ня толькі кіраўніком, але і ўдарнікам-калгаснікам.

Што-ж датычыць каня і цягавай сілы, то вы, напэўна чыталі пастанову ўраду і ЦК нашай партыі за подпісамі т. т. Сталіна і Молатава. Гэта пастанова выдана на аснове фактаў жыцьця. Колькі фактаў, калі коні стаяць у стайні: пашова стайні пустая, а коні збіты ў адзін бок; каросьлівыя трупца бакамі са здаровымі. Пытаешся кіраўніка калгасу: «навошта ты гэта зрабіў?» Ён адказвае: «Ды як жа, холадна, а нам вэтэрынар сказаў, каб коняй не роскідаць па вялікай стайні».

Відавочна, гэты вэтэрынар або дурань, або шкоднік. А атрымліваецца ўсё роўна шкодніцтва, бо ставіць паросьлівых коняй побач са здаровымі значыць заразіць усіх коняй. Кожны з вас ведае, што значыць догляд каня. Вы добра ведаеце, што карміць коняй — гэта ня проста наваліць сена ці саломы. Важна — калі наваліць, як наваліць, якую салому, ці разрубіць яе на сечку, паловy-мякіну, шакарыць, прытрымаць канцэнтраваныя кармы да вясны, а зараз карміць іншым і г. д.

У адным калгасе мне давялося бачыць такі малюнак, — падышоў я да стайні, а яна зачынена. Конюха няма. Паслалі шукаць, 45 мінут шукалі. Ледзь знайшлі. Я яго пытаюся: «як жа ты накідаеш коняй закрытымі без догляду». Адчынілі стайню — у ёй бруд. Подсьціл няма. Сена валяецца на падлозе. Няма ніякага догляду. Да вясны ня рыхтуюцца, а потым будуць шукаць прычыны, моў, паогул дрэнна з конямі. **І так, трэба правільна арганізаваць кармленьне, вадапой, дагляд коняй, чыстку іх і інш.**

Я павінен сказаць, што і ў гэтай справе таксама было шкодніцтва. Часам людзі сумленныя, якія не зьяўляюцца шкоднікамі, так даглядаюць коняй, што на справе атрымліваецца змычка са шкоднікамі. Была выкрыта цэлая арганізацыя шкоднікаў, пачынаючы з некаторых вучоных і канчаючы кулакамі, якія заморвалі коняй, якія прышчаплялі коням хваробу — мэнінгіт, г. зн. запаленьне мазгоў. Зараз гэтыя шкоднікі арыштаваны. Мы з вамі павінны працаваць так, каб паралей шкоднікам ходу ня было, каб мы бачылі ўсё, пачынаючы зьнізу і канчаючы верхам, пачынаючы ад кіруючых органаў па сельскай гаспадарцы і канчаючы калгасамі.

Я ня буду спыняцца падрабязна па падрыхтоўцы сельгасмашын. Ясна, ня дома, што калі лямех не адцягнуты, калі плуг не адрамантаваны, калі барана і бушае не падрыхтаваны аж да дробязяй, ясна, што справу сяўбы мы пасьпяхова не правядзем. Патрэбны пільны кантроль за якасьцю падрыхтоўкі да вясны, аж да такой справы, як вывяз гною. Кожны селянін ведае прыказку: «кладзі гной густа, у сьвіране ня будзе пуста». А ў нас часта адны лічаць, што раз калгас, няма чаго, моў, цацкацца з гноем, другія лічаць, што мы павінны сёньня займацца сусьветнай праблемай, толькі машынамі і хэмічнымі ўгнаеньнямі. А гной гэта глупства. Гэта няверна, таварышы. Мы павялічылі выраб суперфасфату і іншых хэмічных угнаеньняў. Мы пускаем іх, галоўным чынам, на палі тэхнічных культур. Але адначасова з мінэральнымі ўгнаеньнямі мы павінны своячасова вывезьці гной. Я вам гавару, таварышы, самыя простыя, самыя азбучныя рэчы. Можна было іх не гаварыць. Вы іх ведаеце лепш за мяне. Але я гавару іх таму, што сам бачу і вы самі ведаеце, што гэтыя простыя рэчы на мясцох часта ня выконваюцца, а ад гэтага атрымліваюцца дрэнныя рэзультаты.

Пры падрыхтоўцы да вясны можны дзень дораг «днём раней пасеешь —тыднем раней пажнеш». Арганізацыя справы ў нас зараз, сёньня ва многіх калгасах яшчэ не забясьпечвае нам таго, каб як толькі сонейка прыпёкло, каб адразу ўзарацца, шпарка, скора, добра, глыбокім ворывам. Былі ў нас усякія пяворныя тоорый аб ворыве. Верна, усё-ж глыбокае ворыва. «Глыбей араць, больш хлеба жаваць».

Вось цяпер выдвигаецца задача зьмяншэньня страты. Сеяць у грязь, сеяць адразу, як толькі будзе можна. Гэта вельмі добрая справа, гэта трэба ўсямерна праводзіць.

У радзе месц мы маем шмат пустазельля, мы палом і полем іх. Але чаму яны зьявіліся? Ад дрэннай апрацоўкі. Пасеньне не правоблялі, як сьлед. Пасевы не прапальвалі, аралі, сеялі, убіралі несвоячасова, са спазьненнем. Адсюль і пустазельле. З пустазельлем трэба пакончыць. Іх існаваньне—наша ганьба, наш біч. Ачысьціцца ад іх залежыць цалкам ад нас, ад нашага ўменьня арганізаваць справу.

У нас такія мудрацы зьявіліся, што ўхітрыліся ў некаторых калгасах сеяць па-новаму, верхам на кані, так званым рассевам; а варней бросаным пасевам. Ну ад гэтага галоту яшчэ паяпрыемнасьці атрымаліся. Ураджай ніякі. А між тым у нас у краіне цяпер каля мільёну сэнэрак, чаго ніколі раней ня было. Пры правільнай арганізацыі гэтых сэнэрак мы маглі-б, таварышы, у вялізарнай сваёй большасьці зусім упіхнуць ручной сяўбы. Тут і эканомія ў насеньні, тут і лепшы пасеў.

Пры сяўбе ў нас бывае вялікі марудзёж. Насьпалі ў сэнэрку пасеньня, вагар паставілі на 8 пудоў, прышпрубаваў; потым сейбіт гэты вагар адшрубаваў назад, паставіў яго на 5 пудоў. Замест 8, што належыць пасеяць на гэктар, пасеў толькі 5 пудоў, а 3 пуды сабе пакінуў. І гэтым зрабіў урон калгаснікам і дзяржаве не на 3 пуды збожжа, а коньны з вас, вядома, разумее, ён зрабіў урон на 2.030 пудоў збожжа. Тое бывае з ручным пасевам. Чаму гэта адбываецца? Таму, што пасьпешлівасьці ў кіраўнікоў і ў радавых калгаснікаў на ферма. Мы павінны весьці бязьлітасную барацьбу з такімі зладзеямі, таму, што яны губяць калгасную гаспадарку, шкодзяць усім калгаснікам, рабочым і савецкай уладзе.

Вялікую ўвагу трэба зьвярнуць і на тэхнічныя культуры пры сяўбе і ў асабліваньці пры прополцы. У нас, таварышы, частка выкананьне плянаў вылічваецца ў рапартах і ў газетах па колькасьці засеянай плошчы. Мало гія не звяртаюць увагі на прополчныя работы. А вазьмеце вы напрыклад, прополку буракоў. Кожны тур праўды? Якая гэта прапаленая культура, трэба звыш 40 дзён работы на 1 гэктар, 8 раз апрацоўваць, шкароўка, успушчэньне ручнымі плянэтамі, прабоўка, зноў успушчэньне, потым праверка, потым зноў глыбокае ўспушчэньне, потым яшчэ успушчэньне і поліва. Чаму ў нас атрымліваецца месцамі так, што бураў засеялі больш плану, а сабралі значна менш плану? Ды таму, што не прапалолі буракоў. А хто бачыў, як працуюць над буракамі, разумее—не прополеш буракоў, не атрымаеш бураў, або атрымаеш 1/10 таго, што можаш атрымаць.

Я ня буду тут, таварышы, падрабязна затрачаць усіх іншых галін сельска-гаспадарчых работ. Возьмем для прыкладу, касавіцу. Зараз у некаторых калгасах скарджацца, што сена, бачыце, у іх няма. Ляжыць у нас колькі хочаце. Значная частка іх ня скошвалася, не гаварю ўжо аб лясных пакосах у Маскоўскай і ў іншых абласьцях. Усё залежыць ад якасьці работы калгасу. У дрэннага калгасу добрыя сакавітыя лугі, а сена, бачыце, няма, бо своячасова не скасілі, своячасова ня ўбралі. Як відаць, чакаюць, каб мы ў Маскве пакасілі сена на Красным полі або па Арбаце і паслалі ім туды, у калгас (**сьмех**). У добрага калгасу сена пазашпагана толькі хочаце, ён нават можа павычыць таму, хто яго ня мае, у каго жывёла хуцчэй. Гэта ў радзе месц прыдзецца зрабіць, каб жывёла не за гнула, зразумела, з абавязацельствам вярнуць у новую касавіцу.

Сьледаць за пасевам будзе ісьці арганізацыям ўборкі збожжавых. Гэта, таварышы, буйнейшая справа. Пры добрым ураджаі важна ні аднаго дня не прапусьціць. Як гаворыць—адзін дзень год корміць. Спозьнішся ўбраць, зерня асьпяцела, а скачаная ўборка, барацьба са стратамі—гэта вельмі вялікая доля нашага ўраджаю.

І потым **ахова ўраджаю на корані.** У радзе калгасаў і саўгасаў у мінулым годзе былі вялізарныя раскрадваньні збожжа на корані. Мы ня хочам сказаць, што гэта датычыць большасьці калгаснікаў. Але ёсьць яшчэ людзі, якія жывуць старой псыхалёгіяй, якіх кулак шадбухторвае на раскрадваньне калгаснага дабра. Мне самому прышлося бачыць адзін калгас, дзе 7 членаў праўленьня, 5 былых белых казачых падхаручных. Яны самі раскрадвалі калгаснае збожжа і другіх падбухторвалі.

Раней лічылі сьвяшчэннай прыватную ўласнасьць. Яна, як-бы ад бога дана. Кулак заўсёды выступаў у ролі богатыроў. «Як-жа, браты, мая ўласнасьць, яна ад бога». Цяпер той жа кулак, поп і антыкалгасныя людзі, паны ворагі, арганізуюць раскрадваньне і не баяцца «граха божага». Яны лічаць, што грамадзкая ўласнасьць не ад бога, а ад д'ябла. Мы-ж павінны паказаць, што лепш за ўсякага бога і д'ябла змагаемся з ворагамі калгасу, якія раскрадваюць нашу грамадзкую маемасьць. (**Аплёдысмэнты**).

Але для гэтага трэба ўсяцца ўсім за ахову грамадзкай уласнасьці, а гэта ня ўсюды сустрэнеце. **Разлаюцьній пільнасьці, барацьбы за сацыялістычную ўласнасьць няма яшчэ ў многіх работнікаў.**

Або возьмеце такую справу, як арганізацыя малацьбы. Малоцьць, а часта чыстата абмалоту — агідная. Другіх гатункаў і так званых пазадкаў выходзіць у вялізарнай колькасьці. Пытаеш: «Чаму?». Адказ: «А чорт яго ведае, ураджай дрэнны, такое збожжа ўрадзіла». Давайце паглядзім малатарню. Аказваецца, механізм наўмысна сіта перамяшаў, дый у самой малатарні не хапае больш палоны зуб'яў. Зразумела, кожны селянін разумее, што калі не хапае зуб'яў, то значная частка збожжа пры малацьбе пападае ў адходы. Пытаеш сакратара камуністычнай ячэйкі — хлапец з выгляду бойны, носіць кубляцкую шапку на бок. «Як справа стаіць?» «Працуем добра, ды вось ураджай дрэнны». — «Хто табе сказаў?». «А вось людзі кажуць».

Калі мы выявілі, што ў гэтым калгасе 5 белагвардзейскіх падхаручных сядзелі ў праўленьні, калі мы выявілі, што ў малатарні наўмысна былі выбіта больш палоны зуб'яў і сіта перамешаны, а сказаў гэтаму сакратару: «Чаму ты, камуніст, кіраўнік, сакратар камуністычнай ячэйкі, чаму ты не паглядзеў у глыб, з-за чаго прэнны абмалот, чаму ты даў магчымасьць белагвардзейцам шкодзіць калгаснікаў і дзяржаву? Таму, што ты балбатун, таму, што ты не арганізатар, таму, што ў цябе рэвалюцыйная класавая пільнасьць, г. зн. настарожанасьці да ворагаў не стаіць».

Тое, аб чым мы да гэтага часу гаварылі, гэта з тэхнічнага боку сьмяшэйшыя працэсы працы, якія былі і ў аднаасобніка, але зразумела, у калгасах яны ў большым разьмеры. Гэта простыя сельска-гаспадарчыя работы, якія вялікія ведаты і сотні год, горш, ці лепш, і якія зараз пры аб'яднаньні сялян у калгасы мы можам весьці бязупоўна лепш, з большай карысьцю, з большым пагрэбкам, з большым выкарыстаньнем сіл. У калгасах можна рабочую сілу так расставіць, каб была найбольшая выгода для калгасу, каб гаспадарка правесьці работы. Справа заключаецца толькі ў лепшай арганізацыі, у тым, каб выкрыць, каб ужыць прыгаданыя самыя простыя рэчы, якія часамі забываюць. А далей пачынаецца больш складаная справа, тое, чаго раней у аднаасобніка ня было і што зьяўляецца асабліва цяжкай задачай.

Задачы аўладаньня складанымі сельгасмашынамі

